# СВЯТА РОДНАЙ МОВЫ

**Да Міжнароднага дня роднай мовы, які адзначаецца 21 лютага, у дзіцячай школе мастацтваў №2 імя У.У. Алоўнікава адбылося займальнае мерапрыемства: канцэрт-гульня, у якім прынялі ўдзел навучэнцы розных класаў і нават іх бацькі.**

**На працягу ўсяго свята фальклорныя ансамблі і салісты харавога аддзялення выконвалі беларускія народныя песні, байкі, прыгадвалі прымаўкі і прыказкі.**

**Настаўнік па класе харавых дысцыплін Ірына Ігараўна Казлова падрыхтавала для дзяцей пазнавальныя гульні, якія таксама дапамаглі дакрануцца да багатай духоўнай спадчыны беларусаў.**

















